# Багач

## Сцэнарый свята

**Вядоўца.** Шаноўныя госці! Сёння мы запрасілі вас на свята “Багач”. Гэта вялікае свята ў жыцці беларускай вёскі. Калісьці, калі жніво падыходзіла да канца, пакідалі нязжатую жменю жыта — дзедаву ці божую “бараду”, а потым кусцік зажыналі, перавязвалі стужкай, гаварылі замову і ўрачыста, з песнямі і жартамі неслі дадому. Гэта і быў Багач. Яго заносілі ў двор тым, каму жадалі багацця і шчасця. Багач, згодна з павер’ем, забяспечваў ніву жытам і прыносіў у хату дастатак і шчасце.

**Вучань.** Да Багача звярталіся са словамі: “Багач! Багач! Не забывай нашай нівы!”. Менавіта ў гэты дзень, да ўзыходу сонца, гаспадар засяваў ніву жытам. Да азімай сяўбы прыступалі ўрачыста. У хаце ўсё мылася, чысцілася, варылі і пяклі шмат смачнага.

**Вучаніца.** Адпраўляючыся на засеўкі, селянін апранаў белую кашулю, а вечарам спраўлялася ўра-чыстая вячэра. Чысціня ў хаце, святочнае адзенне сейбіта, дастатак на стале лічыліся абрадавымі эле-ментамі, што спрыяла поспеху ў працы, урадлівасці засеянай нівы.

*(Выходзіць вучань, на галаве вянок з каласоў, у руках па пучку каласоў, ён увасабляе жытняе поле.)*

**Вучань.** Гаварыла поле шырокае, жыта ядранае. Жнейкі, жнейкі мае маладыя, сярпы залатыя. Прыхо-дзьце да мяне заўтра рана, каб я недажатым не стаяла. Не хачу я ў полі стаяці, апошнімі каласамі махаці, а толькі хачу я ў полі стагамі, а ў гумне капамі.

*(За сцэнай чуецца песня, выходзяць жнейкі, выконваюць песню “Расло жыта ,расло ў полі”. Словы і ноты для гэтай і ўсіх астатніх песень змешчаныя ў дадатку.)*

**1-я жнейка.** Хлопцы, дзяўчаты, вы толькі пагля-дзіце, апошняя палоска жыта засталася!

**2-я жнейка.** Вось зараз дажнём і можна бараду завіваць, Багача рабіць ды свята спраўляць.

**3-я жнейка.** Ніўцы дзякаваць будзем за добры ўраджай.
*песня “Наша ніўка залатая”.)*

**10-я жнейка.** Дык давайце паспяшаем бараду зажынаці ды дажыначны сноп вязаці.

*(Жнейкі складаюць каласы ў адзін сноп, плятуць з каласоў вянок і спяваюць песню "Ой, у садочку цвіла лілея".)*

**1-я жнейка.** Каго багіняй выберам?

**2-я жнейка.** Давайце самую працавітую і прыгожую дзяўчыну!

*(На галаву багіне ўскладаюць вянок, у рукі даюць сноп, абкружаюць яе ланцужком і спяваюць песню "Кружком, дзевачкі, кружком".)*

**Багіня.** Дык давайце ж гаспадару дажыначны сноп аднясём.

Сцэна 2.

*Зала прыбрана пад вясковую хату. Развешаны саматканыя ручнікі, дываны.*

Уваходзіць па святочнаму апранутая гаспадыня з вышытым настольнікам, якім засцілае стол.
**Гаспадыня***(гучна).* Васіль, прынясі мне тыя кветкі, што ў збане стаяць.

*(Уваходзіць гаспадар з букетам)*

**Гаспадар.** Можа ніхто не прыйдзе, а ты ўсё увіхаешся.
**Гаспадыня.** *(ставячы на стол букет)* Прыйдуць, абавязкова прыйдуць, ідзі, Васілька апраніся па святочнаму. Сёння ж Багач, а я тым часам накрыю стол.
**Гаспадар.** Ды іду ужо, Мар'ечка, іду. *(выходзіць)*

*(Гаспадыня выносіць і ставіць на стол розныя стравы. За сцэнай чуюцца песні, музыка)*

**Гаспадыня.** Васіль, дзе ты падзеўся? Ужо госці ідуць, Дажыначны сноп нясуць.

**1.госць.***(сеючы зерне)* Ідзе сноп багаты – адчыняй дзверы, хто яму рады.
**Гаспадар.***(адчыняе дзверы)* Вельмі рад я Багатаму снапу. Дзверы адчыніць хачу.

*(Усе адпраўляюцца да гаспадара, спяваюць песню "Адчыняй, гаспадар, свой двор". Багіня ідзе першая.*

*Насустрач выходзяць гаспадары з хлебам-соллю. Багіня выступае наперад і, пакланіўшыся гаспадарам, кладзе да іх ног дажыначны сноп. Вянок перадаюць у рукі, прыгаворваючы.)*

**Багіня.** Паздароў Божа, гаспадару! Прыняслі табе вянок з шырокага поля, з ядранага жыта.

**3-я жнейка.** Гаспадар свайго гаспадарства не страціць, калі нам за вянок добра заплаціць, хоць чырвоныя боты для нашай ахвоты — жыту на ўраджай, гаспадару на доўгі век.

**4-я жнейка.** Гаспадару вянок, а нам квасу збанок.

**5-я жнейка.**

Прынеслі вам плён

З чатырох старон.

Прынеслі вам збор

З-пад зялёных гор,

І з гары, з-пад гары на гаспадарскія двары,

З падвароў да каморы на ўсялякія зборы...

**6-я жнейка.** Гаспадынька, ну-тка! Завіхайся хутка, так, як мы завіхаліся каля ніўкі. Даставай лубку , зараз сноп урачыста аббмалоцім . ссыплем зерне (абмалочваюць) Затым уставім свечку, запалім яе ды паглядзім, які у нас "багач" атрымаўся.

Гаспадар (трымаючы у руках багач,гаворыць):Слаўны багач. Добрае ўрадзіла жыта

**2.госць.**Ішоў ен чыстымі нівамі, Вез багаты ўраджай вазамі.
**3.госць.**Прыйшоў багач – кідай рагач.
**4.госць.**Бяры сявеньку ды сей pамаленьку.
**5.госць.**Багача на пачэсны кут адпраўляем. *(1.госць ставіць сявеньку на покуць)*
**6.госць.***(з паклонам)* А вам шчасця, здароўя жадаем, дастатку жадаем!
**7.госць.**Дык няхай жа вам будзе чыста ў полі!
**8.госць.**Багата ў хаце!
**9.госць.**Даўгалецця і згоды!
**10.госць.**Век гора не знаці!
**Гаспадар.** *(з паклонам)* Дзякуй, дзякуй, што хату не абышлі!
**Гаспадыня.** *(з паклонам)* Добрыя словы для нас знайшлі!
**Гаспадар.** А цяпер, дарагія госцейкі, за стол сядайце.
**Гаспадыня.** Нашых пачастункаў паспытайце.

*(госці сядаюць за стол, частуюцца, хваляць ежу)*
**6.госць.**
Няхай вам, гаспадарочкі, заўсёды шанцуе!
Няхай вам жыццё шчасце даруе!
*(гаспадары дзякуюць. Чуецца стук у дзверы.)*

**Гаспадар.** Калі ласка, заходзьце. *(Уваходзіць дзяўчына Восень.)*

**Гаспадыня.** *(радасна).* Дык гэта ж багіня – Восень! Праходзьце, калі ласка, будзьце як дома.
**Усе разам.** Восень, Восень, у госці просім!
**Восень.** Добры вечар у хату! *(Кланяецца гасцям і гаспадарам)*
Хай вам жывецца заўсёды багата! *(абсыпае ўсіх зернем, лісцем)*
Прыскакала Восень на залатым канёчку,
Ураджай багаты прывезла гаспадарочкам.
Дастаткам і радасцю людзей адарыла,
Ярак-жоўтым золатам усё наўкол пакрыла.

**Гаспадар.** Дзякуй нашай Восені-багіні. Сядайце адпачніце з далёкай дарогі. *(Восень садзіцца)*
**Восень.**
А вы, госцейкі, ці ўжо гадалі?
З "лёгкай" рукой сейбіта ці шукалі?
**7.госць.**
Ой, нешта мы, багінечка Восень, загаварыліся ,
Ды пра гаданне тое забыліся.
**Гаспадыня.**
А я рэшата яек адварыла.
Усё вас чакала, пра вас гаварыла.
*(Гаспадар прыносіць рэшата з яйкамі. Гаспадыня частуе яйкамі усіх гасцей, адно пакідае сабе).*

**Восень.** А цяпер да справы прыступім, чыста яйкі аблупім. *(Восень ходзіць і разглядае аблупленыя яйкі.)*
Каму круглае, без ямкі прыпадае,
Той першы ніву засяваць пачынае.
Выйграў гаспадар гэтай хаты,
Няхай жа рука яго будзе лёгкай і багатай!
*(Восень надзявае жытнёвы вянок на галаву гаспадару. Усе водзяць карагод у сярэдзіне якога стаіць гаспадар, і спяваюць:)*
Свайму гаспадару мы зрабілі славу.
Жытачка нажалі, ў копы склалі. (2 разы)
Сеяць наказалі.
Гаспадару, дажыначкаў час – адары ты нас. (2 разы)
Гаспадару наш, адары ты нас,
Пойдзем, пойдзем да двара
Мы да дзядзькі Захара
Адары ты нас. (2 разы)

**Гаспадыня.** Дорым збаночак мёду, каб салодка было на дарогу.
**Гаспадар.** А яшчэ дорым грошы, каб кожны быў прыгожы і харошы.

**Госці.** Дзякуй, дзякуй!
**8.госць.**
А ці можна ў вас дазволу папытаць.
Каб ў гэтай добрай хаце “Лявоніху” паскакаць?
*(усе спяваюць ды прытанцоўваюць)*
Ды не толькі паскакаць, а яшчэ й прытопнуць.
У вашай хаце падмурачак няхай жа не лопне.
**Гаспадары.** Калі ласка, паскачыце, нас, старых, павесяліце. *(Усе танцуюць “Лявоніху”)*

**Восень.**
А цяпер, каб вы не сумавалі,
трэба каб у конкурсе сябе паказалі.
Хто з завязанымі вачыма болей клубняў назбірае,
той смачны пачастунак атрымае.
*(Збіраюць з завязанымі вачыма бульбу).*
А цяпер ні на што не зважайце,
а мой конкурс пачынайце!
*(Пераможца атрымлівае ад Восені прыз)*
**1.госць.**
На Багачы, на Багачы
Усё навокал чыста, хоць рагачы.
**2.госць.***(з паклонам)*
Дай Божа гэтай хаце ніколі дрэннага не знаці!
**3.госць.**
Каб было чым засяваці, абсяваці!
**4.госць.**
Ды яшчэ болей жаць, нажынаці.
**Усе разам.**
А праз год новага Багача дачакаці!

***Дадатак***




Расло жыта, расло ў полі,

Прыйшлі жнейкі жыта жаць.
Усе разам, усе разам
Прыйшлі жнейкі жыта жаць.
Узялі з сабой сярпочкі,
Сталі жыта падразаць.
Усе разам, усе разам
Сталі жыта падразаць.
Сонца свеціць добра ў полі,
Будзем песенькі співаць.
Усе разам, усе разам
Будзем песенькі співаць.




Наша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя.
Наш пан-гаспадар маўляе,
Штоб мы не былі чорствыя.
— Ой, чыё ж тое поле
Зажаўцелае стаіць?
— Гэта поле Васілёва
Зажаўцелае стаіць.
Жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя,
Ды зялён бор зялёны
Над усімі барамі.
Ды славён наш гаспадар
Над усімі гаспадарамі.
Пагуляем з табою,
Развесялім гаспадара
І гаспадыню маладую,
І чалядку весялую.
Наша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя.




Ой, у садочку цвіла лілея,
Дажала жыта старшая жнея.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.
Па нашым полі беглі лябёдкі,
Дажалі жыта красны малодкі.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.

І Па нашым полі беглі ягняты,
Дажалі жыта красны дзяўчаты.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.
А наш вяночак не па-такому,
Кожны каласочак па залатому.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.
Каб мы здаровы спажывалі
І год шчаслівы зноў дачакалі.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.
Засцілай, пане, сталы і лавы,
Бо да цябе ідзе госць небывалы.
Збор жыта, збор! Нашаму пану ў двор.

**Кружком, дзевачкі, кружком**



Кружком, дзевачкі, кружком
К гаспадару з паклонам Не самі мы ідзём,
Мы вяночак нясём.
У нашай гаспадыні
Поўна хлеба ў адрыне.
Трэба пакланіцца,
каб к ёй дабыцца.
Будзь сяло весяло,
Бо вянок мы несямо
З добрага жыта,
Вельмі красавіта.

**Адчыняй, гаспадар, свой двор**



Адчыняй, гаспадар, свой двор.

Бо вязём увесь жніўні збор.
Ай, нажалі, навязалі копачак,
Як на небе зорачак.
Спраў жа нам, гаспадар, дажынкі.
Бо мы страцілі ўсе свае сілкі.
Адчыні, гаспадар, сваю хатку.
Упусці багіню-матку.

Забі нам, гаспадар, барана.
Забі нам вялікага быка,
Забі нам свае гускі,
Не пажалей цялушкі.
Не крыйся, гаспадар, перад намі,
Бо мы бачым цябе вокнамі,
Выйдзі да нас, выйдзі да нас,
Выкупі вянок у нас.




Ах, вы, столікі мае,
Вы цясовенькія!
А чаго ж вы стаіцё
Незасцеленыя?




Кругом яра, кругом зелянога,
Кругом яра, кругом зелянога.
Толькі відзен дубок зяляненькі,
Толькі відзен дубок зяляненькі.
Пад тым дубам дзяўчына стаяла,
Пад тым дубам дзяўчына стаяла.
Ды ўраніла залато вядзерца,
Ды ўраніла залато вядзерца.
А хто ж маё вядзерца дастане,
А хто ж маё вядзерца дастане,
Той са мною ў карагодзе стане,
Той са мною ў карагодзе стане.
Аказаўся казак маладзенькі,
Аказаўся казак маладзенькі.
А я тваё вядзерца дастану,
А я тваё вядзерца дастану.

Я з табою ў карагодзе стану,
Я з табою ў карагодзе стану.




Як на нашай ніўцы сягоння дажынкі.
Дзіва, дзіва, да!
Відзіць маё вочка краёк недалёчка.
Дзіва, дзіва, да!
Да краю дажнёмся, мёду мы нап’ём

Дзіва, дзіва, да!
Наш хазяін Савасцей дасць гарэлкі берасцень.
Дзіва, дзіва, да!
Хазяйка-цяцера паставіць вячэру.
Дзіва, дзіва, да!
Наварыла буракоў, насыпала чарвякоў.
Дзіва, дзіва, да!
Наварыла кашы, насыпала сажы.
Дзіва, дзіва, да!